**Даныя судовай статыстыкі 1872–1913 гг. як крыніца вывучэння беларускага грамадства перыяду капіталізму**

Гушчынскі І.Г. г. Мінск (БДПУ)

Звесткі судовай статыстыкі (колькасць злачынстваў па тых ці іншых катэгорыях, даныя аб асуджаных, іх сацыяльным палажэнні, полу, узросце, нацыянальнасці, веравызнанні, адукацыі, прафесіі і г. д.) звычайна выкарыстоўваюцца ў крыміналогіі, якая займаецца вывучэннем злачыннасці, яе прычын і ўмоў, а таксама пошукам шляхоў і сродкаў яе папярэджання і барацьбы з ёй. У той жа час статыстычная інфармацыя аб злачыннасці ў мінулым можа быць карысна і для гісторыкаў пры даследаванні таго ці іншага грамадства ў пэўную гістарычную эпоху, у прыватнасці – гісторыі Беларусі перыяду капіталізму. Справа ў тым, што, з аднаго боку дынаміка злачыннасці дэтэрмінуецца зменамі палітычных, эканамічных, сацыяльных, і іншых умоў жыцця людзей, а з іншага –як сацыяльная з’ява яна сама з’яўляецца адным з індыкатараў развіцця грамадства, у першую чаргу яго маральнага аблічча.

Судова-статыстычныя даныя ў апошняй трэці XIX – пачатку XX ст. збіраліся Міністэрствам юстыцыі двумя шляхамі. Першы з іх – абавязковае прадастаўленне судовымі ўстановамі статыстычных справаздач па вызначанай міністэрствам форме. У першую чаргу, гэта штогадовыя, пакватальныя і памесячныя “Отчётные ведомости” акруговых судоў і судовых следчых, якія знаходзяцца ў фондах Мінскай аб’яднанай палаты крымінальнага і грамадзянскага суда [3], а таксама Мінскага акруговага суда [4] (адпаведныя матэрыялы па Віцебскай і Магілёўскай губернях былі, нажаль, страчаныя пад час ІІ сусветнай вайны) НГАБ у Мінску. Гэтыя дакументы ўтрымліваюць інфармацыю аб колькасці праведзеных следстваў па пэўных артыкулах Улажэння аб пакараннях; колькасці апраўданых і вызваленых з-пад суда; асуджаных з указаннем меры пакарання, іх сацыяльнага статусу, веравызнання і адукацыйнага ўзроўню. Другі – гэта так званая “купонная” (ці “карткавая”) сістэма справаздачнасці, якая заключалася ў наступным: да ўзбуджанай крымінальнай справы падшываўся адмысловы сшытак, які складаўся з 12 купонаў, кожны з якіх адлюстроўваў адпаведную стадыю крымінальнага працэсу. Кожны з купонаў запаўняўся па заканчэнні той ці іншай стадыі і адсылаўся ў Міністэрства юстыцыі. Менавіта даныя “купоннай” сістэмы ляжалі ў аснове “Сводов статистических сведений по делам уголовным, производившимся в судебных учреждениях, действующих на основании уставов Императора Александра II”. Апошнія з’яўляюцца найбольш поўнай і дасканалай крыніцай судовай статыстыкі дадзенага перыяду. У іх утрымліваецца інфармацыя па ўсіх судовых установах, якія дзейнічалі на аснове Судовых статутаў ад 20 лістапада 1864 г., што дае магчымасць зрабіць параўнаўчы аналіз злачыннасці Паўночна-Заходняга краю і іншых рэгіёнаў Расійскай імперыі. Пачалі яны складацца з 1872 г., а апошні з іх адносіца да 1913 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Пры даследаванні палітычнай сітуацыі ў Паўночна-Заходнім краі ў адзначаны перыяд найбольшую цікавасць уяўляюць даныя па крымінальных справах аб палітычных злачынствах (яны былі прадугледжаны арт. 241–261 Улажэння аб пакараннях). Аднак менавіта па іх наяўныя статыстычныя звесткі самыя няпоўныя і найменш аб’ектыўныя. Пачынаючы з выдання за 1879 г. у “Сводах статистических сведений по делам уголовным” зусім не ўтрымліваеца даных аб колькасці абвінавачаных ці асуджаных за здзяйсненне дзяржаўных злачынстваў. Такая інфармацыя да выдання закона ад 7 ліпеня 1904 г., які прадугледжваў увядзенне статыстычнай справаздачнасці па такіх справах па ўзору агульнакрымінальных, апублікаванню не падлягала, а самае галоўнае – фактычна не падвяргалася ніякай статыстычнай апрацоўцы. І ўсё ж, дзякуючы намаганням старшыні Статыстычнага камітэта пры Мінстэрстве юстыцыі Е.Н. Тарноўскага, пэўная праца ў гэтым накірунку была праведзена. Звесткі аб колькасці асуджаных за палітычныя злачынствы аказаліся недаступнымі нават яму, аднак сабраць інфармацыю аб прыцягнутых да дазнанняў у якасці абвінавачаных па такіх справах у 1884–1903 гг. ён змог [11]. У прыватнасці ён падае звесткі аб дынаміцы палітычнай злачыннасці ў гэтыя гады на тэрыторыі Паўночна-Заходняга краю. Згодна гэтым даным найбольш значны яе рост адбыўся менавіта тут: у 1901–1903 гг. у параўнанні з перыядам 1884–1890 гг. сярэднегадавая колькасць абвінавачаных у дзяржаўных злачынствах у акрузе Віленскай судовай палаты ўзрасла з 17 да 228, гэта значыць у 13,4 раза (гэта самы значны паказчык па краіне) [11, с. 89–90]. У ліку 21 горада Расіі з насельніцтвам звыш 200 тыс.чалавек, у якіх у 1901–1903 гг. на 1 млн. жыхароў прыходзілася больш 200 абвінавачаных у палітычных злачынствах, былі Вільна, Мінск і Віцебск. Прычым асабліва выдзяляўся апошні, у якім на раду з Кіевам і Коўна прыходзілася звыш 500 палітычных абвінавачаных на 1 млн. жыхароў. Сярод больш дробных гарадоў на першым месцы ў імперыі па гэтаму паказчыку ў адзначаны перыяд была Смаргонь [11, с. 93]. Найбольш значны рост палітычнай злачыннасці ў канцы XIX – пачатку XX ст. менавіта ў Заходнім краі Е.Н. Тарноўскі тлумачыў у першую чаргу пражываннем тут значнай колькасці яўрэяў, якія па статыстыцы былі найбольш склонныя да ўдзелу ў палітычнай барацьбе. Так, так сярод жыхароў Мінскай, Гродзенскай, Віленскай і Ковенскай губерняў, якія ўваходзілі ў склад акругі Віленскай судовай палаты, іудзеяў было ў 1901–1903 гг. прыкладна 15 %, а іх доля сярод абвінавачаных у палітычных злачынствах у гэты перыяд па дадзенай акрузе складала 64,9 %. Гэта быў самы вялікі паказчык па краіне [11, с. 83]. У той жа час адпаведныны паказчык для каталікоў складаў 28,7 %, а для праваслаўных – усяго 5,4 % [11, с. 95]. Тлумачыцца ж больш высокая ступень удзелу яўрэяў у барацьбе з рускім абсалютызмам перш за ўсё агульнаправавым становішчам іх у Расіі, а не расавымі ці рэлігійнымі асаблівасцямі [1, с. 146].

У “Сводах статистических сведений по делам уголовным” звесткі аб палітычных злачынствах пачалі друкавацца толькі з выдання з данымі за 1905 г. Аднак гэта інфармацыя выклікае пэўны недавер. Справа ў тым, што тут не

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ўлічваліся справы, пераданыя ў адпаведнасці з Палажэннем аб надзвычайнай ахове да разгляду ў вайсковых судах. Яшчэ адна праблема для аналіза статыстычных звестак па палітычных злачынствах – тое, што асноўная колькасць такіх спраў разглядалася ў судовых палатах, якіх на тэрыторыі Беларусі не было. У "Сводах статистических сведений по делам уголовным" друкаваліся даныя аб асуджаных за дзяржаўныя злачынствы судовымі палатамі, але без указання, у якой канкрэтна губерні гэтыя справы ўзнікалі. Акруговыя суды Беларусі ўваходзілі ў склад розных судовых палат (Мінскі і Гродзенскі – Віленскай, Віцебскі – Пецярбуржскай, Магілёўскі – Кіеўскай), у сувязі з чым фактычна немагчыма вылучыць лічбы аб такіх злачынствах, якія ўзніклі менавіта на тэрыторыі Беларусі. Найбольш мэтазгодна тут выкарыстоўваць звесткі па Віленскай судовай палаце, большую частку акругі якой складалі беларускія землі.

Без выкарыстання судова-статыстычных матэрыялаў немагчыма і вывучэнне ўласна судовай сістэмы. Суадносіны колькасці асуджаных і апраўданых сведчаць аб узроўню рэпрэсіўнасці судовых органаў па тых ці іншых катэгорыях спраў. Так, у Заходнім краі рэпрэсія судовых устаноў была больш слабай, чым у сярэднім па краіне, аднак па справах, вырашаных з удзелам прысяжных засядацеляў, яна, наадварот, была больш высокай [2, с. 85]. Пастаянны рост у 1880–90-я гг. колькасці крымінальных спраў, вырашаных без удзелу прысяжных засядацеляў сведчыць аб мэтанакіраванай палітыцы ўрада па абмежаванні гэтай формы суда. Так напрыклад, калі ў 1884 г. Віцебскім акруговым судом сапраў з іх удзелам было вырашана у 1,4 разы больш, чым без, то ў 1892 г., наадварот, у 1,3 разы менш [12, с. 28]. У выніку шэрагу мер улад па абмежаванні судовай рэформы 1864 г. пастаянна зніжаўся і працэнт спраў, разглядаемых судовымі ўстановамі публічна. Гэта пацвярджаецца і статыстычнымі данымі: за перыяд з 1887 г. па 1900 г. іх доля ў Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай, Гродзенскай і Віленскай губернях знізілася з 97 % да 88 %, хаця ўцэлым па краіне за гэтыя гады адпаведная дынаміка была не такой значнай – з 97% да 92 % [7, ч. I, с. 20–23], [8, ч. I, с. 42–49]. На аснове супастаўлення колькасці паступіўшых і канчаткова вырашаных у судовых установах спраў можна вызначыць ступень эфектыўнасці іх дзейнасці у пэўныя гады.

Напэўна галоўным індыкатарам маральнага аблічча таго ці іншага грамадства з'яўляецца ўзровень злачсыннасці ў ім. У канцы XIX ст. у акрузе Віленскай судовай палаты разам з тэрыторыямі Сібіры колькасць асуджаных агульнымі судовымі ўстановамі па крымінальных справах адносна колькасці пражываўшага тут насельніцтва была найвышэйшай па краіне [6, Общий обзор, с. 25]. Аднак гэта не сведчыць аб маральным заняпадзе грамадства Паўночна-Заходняга краю, а хутчэй наадварот. Справа ў тым, што гэтыя тэрыторыі займалі першае месца па краіне па справах, узбуджаных у парадку прыватнага абвінавачання (абраза гонару, пабоі і г. д.) [6, Общий обзор, с. 25–26]. Гэта гаворыць толькі аб тым, што жыхары гэтай мясцовасці былі больш склонны да звароту ў суд. У той жа час па найбольш цяжкіх злачынствах (забойства,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

нанясенне калецтваў, гвалтаванне), колькасць асуджаных тут не перавышала сярэднія па краіне лічбы, а была нават ніжэйшай [2, с. 85–86]. Адметна, што на тэрыторыі Беларусі, разам з Прыбалтыкай і Прывісленскім краем, значна менш распаўсюджанымі, чым уцэлым па імперыі, былі злачынствы супраць жаночага гонару [2, с. 131].

Даныя судовай статыстыкі дазваляюць паставіць у пэўную залежнасць узровень склоннасці грамадзян да парушэння закону ад іх веравызнання. Так, па звестках за 1906–1910 у разліку на 100 тыс. чалавек кожнай канфесіі асуджаных агульнымі і міравымі судамі ў Расіі было: пратэстантаў – 121, каталікоў – 119, праваслаўных – 111, іудзеяў – 86, мусульман – 45. Прычым на працягу ўсёй адзначанай пяцігодкі на фоне агульнага росту злачыннасці сярод усіх веравызнанняў прыкладна захоўваецца адносная розніца паміж колькасцю асуджаных розных канфесій [5, Общий обзор, с. 50], што дае нам магчымасць выводзіць з адзначаных статыстычных звестак пэўныя заканамернасці.

Заходнія губерні Расійскай імперыі, у прыватнасці беларускія, асоба выдзяляліся у гэты перыяд вельмі вялікім, у параўнанні з іншымі рэгіёнамі краіны, узроўнем жаночай злачыннасці [2, с. 140]. Аднак гэта сведчыць не столькі аб нізкай маралі мясцовых жанчын, сколькі аб больш высокай іх тут эмансіпацыі. Справа ў тым, што ў цэлым значна меншыя маштабы жаночай злачыннасці, у параўнанні з мужчынскай, тлумачацца не столькі біялагічнымі фактарамі, сколькі палажэннем жанчыны ў грамадстве, яе адхіленасцю ад палітычнага і грамадскага жыцця [1, с. 135–136]. Па меры ж пашырэння сферы дзейнасці жанчын, натуральна расла і колькаць здзяйсняемых імі злачынстваў.

Карыснымі судова-статыстычныя звесткі могуць быць і пры даследаванні сацыяльна-эканамічнай сферы, перш за ўсё гэта тычыцца даных па грамадзянскіх справах. Галоўная праблема тут – тое, што Міністэрства юстыцыі асноўную ўвагу ўдзяляла статыстычнай справаздачнасці па крымінальных справах, чаго нельга сказаць пра справы грамадзянскія, статыстыка якіх амаль не друкавалася і такога выдання, як “Свод статистических сведений по делам уголовным”, адносна менавіта іх не было. Напэўна адзіную папытку сабраць і абагульніць статыстычныя звесткі па грамадзянскіх справах зрабіў Е.Н. Тарноўскі ў адным са сваіх артыкулаў [9]. У фондзе 183 НГАБ у г. Мінску маюцца “Ведомости о движении гражданских дел” па Мінскаму акруговуму суду за 1884–1909 гг. Адпаведныя ж звесткі па Магілёўскаму і Віцебскаму акруговым судам адсутнічаюць. Яны, верагодна, былі згублены падчас ІІ сусветнай вайны. Дынаміка руху колькасці грамадзянскіх спраў, а таксама кошту іскаў з’яўляецца своеасаблівым індыкатарам інтэнсіфікацыі эканамічнага жыцця грамадства, ці наадварот, замядлення яго развіцця. Справа ў тым, што разам з ростам колькасці здзелак натуральна павялічваюцца і лічбы ўзнікаючых у судах спрэчак па іх, а таксама велічыня спагнанняў, патрабуемых у ісках. Паказчыкам інтэнсіфікацыі эканамічнага жыцця грамадства з’яўляюцца таксама статыстычныя даныя органаў натарыята: аб колькасці зацверджаных дакуметаў, сумах натарыяльных збораў і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

г. д. Падобнага роду звесткі ўтрымліваюцца ў фондах 147, 183 і 1424 НГАБ у г. Мінску.

Як бачым, судова-статыстычныя даныя могуць быць выкарыстаны ў гістарычных даследаваннях па многіх накірунках. Аднак да іх ужывання трэба падыходзіць вельмі асцярожна. Справа ў тым, што лічбы тут зачастую змяняліся не ў выніку росту ці зніжэння колькасці пэўных катэгорый злачынстваў, а як следства ўнясення змяненняў у заканадаўства (перш за ўсё Улажэнне аб пакараннях); атрымання судовымі ўстановамі рознага роду сакрэтных прадпісанняў ад Міністэрства юстыцыі і адміністрацыйных улад; эфектыўнасці працы органаў паліцыі, пракуратуры, судовых следчых; а таксама шэрагу суб'ектыўных фактараў. Так, згодна статыстычным звесткам за 1904–1906 гг., у гэты час па краіне назіраецца пэўнае памяншэнне колькасці асуджаных ў параўнанні з папярэднімі гадамі. Аднак тлумачыцца гэта не зніжэннем ўзроўню злачыннасці, а шэрагам іншых фактараў: выданнем Маніфеста 11 жніўня 1904 г., згодна якому значная колькасць абвінавачаных была вызвалена з-пад суда; руска-японскай вайной, па прычыне якой многія маладыя мужчыны (па статыстыцы менавіта гэтай катыгорыяй грамадзян здзяйснялася большасць злачынстваў) аказаліся па-за межамі імперыі; спецыфічнымі ўмовамі дзейнасці судоў і паліцыі ў рэвалюцыйны час, калі разгляд многіх крымінальных спраў (перш за ўсё палітычных, а таксама аб грабяжах і забойствах) быў перададзены ваенным судам, а мелкія праступкі нярэдка заставаліся безпакараннымі па прычыне таго, што паліцыя і суд большую ўвагу ўдзялялі іншым злачынствам [10, с. 57–58].

Такім чынам даныя статыстычнай справаздачнасці судовых устаноў, а таксама Міністэрства юстыцыі апошняй трэці XIX – пачатку XX ст. з'яўляюцца каштоўнай крыніцай для вывучэння гісторыі беларускага грамадства перыяду капіталізму. Прычым не толькі пры даследаванні ўласна судовай сістэмы краю, але і яго сацыяльна-эканамічнага развіцця, палітычнай абсаноўкі ў ім, а таксама менталітэта і маральнага аблічча беларусаў у гэты час.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Бібліяграфічны спіс**

1. Гернет, М.Н. Моральная статистика (уголовная статистика и статистика самоубийств). С приложением 16 диаграмм и образцов-листков уголовной статистики и статистики самоубийства: пособ. для статистиков и криминалистов / М.Н. Гернет. – М : Центральное статистическое управление, 1922. – [2], VII, 269 с.

2. Итоги русской уголовной статистики за 20 лет (1874–1894). Приложение к № 7 "Журнала Министерства Юстиции" (сентябрь 1899 г.) / Сост. в статистическом Отделении Министерства Юстиции, при ближайшем участии Е.Н. Тарновского. – СПб : Типография Правительствующего Сената, 1899. – VI, 407 с., прилож.

3. НГАБ.– Фонд 147. – Минская соединённая палата уголовного и гражданского суда 1867–1883 гг.

4. НГАБ.– Фонд 183. – Минский окружной суд 1883–1918 гг.

5. Свод статистических сведений о подсудимых, оправданных и осужденных по приговорам общих судебных мест, судебно-мировых установлений и

учреждений, образованных по законоположениям 12 июля 1889 года, за 1910 год: в 2-х ч. / Издание министерства юстиции. – СПб : Сенатская типография, 1913. – [2], V, 72, 211, 179, XIII, [1] с.
6. Свод статистических сведений по делам уголовным, производившимся в 1898 году в судебных учреждениях, действующих на основании уставов Императора Александра II: в 3-х ч./ Издание Министерства юстиции. – СПб : Сенатская типография, 1901. – 48, 73, 303, 147, XII с.
7. Свод статистических сведений по делам уголовным, производившимся в 1887 году в судебных учреждениях, действующих на основании уставов Императора Александра II: в 3-х ч./ Издание Министерства юстиции. – СПб : Типография Правительствующего Сената, 1891. – [8], 42, 177, 61 с.
8. Свод статистических сведений по делам уголовным, производившимся в 1900 году в судебных учреждениях, действующих на основании уставов Императора Александра II: в 3-х ч./ Издание Министерства юстиции. – СПб : Сенатская типография, 1903. – 48, 81, 303, 183, XIII с.
9. Тарновский, Е.Н. Движение гражданских дел в общих и мировых судебных установлениях за 1899–1908 гг. / Е.Н. Тарновский // Журнал Министерства юстиции. – 1910. – №3. – С. 51–73.
10. Тарновский, Е.Н. Движение преступности в Российской империи за 1899–1908 гг. / Е.Н. Тарновский // Журнал Министерства юстиции. – 1909. – № 9. – С. 52–99.
11. Тарновский, Е.Н. Статистические сведения о лицах, обвиняемых в преступлениях государственных / Е.Н. Тарновский // Журнал Министерства юстиции. – 1906 – №4. – С. 50–99.
12. Шенинг, В.А. Очерк истории Витебского Окружного суда (1883–1893) / В.А. Шенинг. – Витебск : Губернская типография, 1894. – 69 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ